Падтрымай "Вясну" на PATREON

# Сёння - 12 судоў за Дзень волі

28.04.2016 **Тэгі**: суды, адміністратыўны пераслед



Дзень волі ў Мінску 25 сакавіка 2016 года.

28 красавіка ў Мінску працягнуцца суды над удзельнікамі Дня волі. Паколькі дазволенае шэсце часткова праходзіла не па заяўленым маршруце, на многіх удзельнікаў масавага мерапрыемства былі складзеныя пратаколы аб адміністрацыйных правапарушэннях.

У судзе Савецкага раёна Мінска разглядаюцца справы:

**Касі Людвіг** (пачатак у 10 гадзін, суддзя С. Салапан), пастанова - штраф 25 базавых велічынь, 5 мільёнаў 250 тысяч.

**Максіма Вінярскага** (10-00, суддзя Фёдарава), пастанова - штраф 35 базавых велічынь.

**Алеся Макаева** (10-00, суддзя Д. Жданок), пастанова - штраф 30 базавых велічынь.

**Яўгена Батуры** (10-00, суддзя Драчова), пастанова - штраф 30 базавых велічынь.

**Мікалая Коласа** (14-30, суддзя Драчова), пастанова - штраф 20 базавых велічынь.

**Дзмітрыя Паліенкі** (10-00, суддзя Круковіч), вынік суда пакуль невядомы.

**Дзмітрыя Сільчанкі** (14-30, суддзя Абрамовіч), пастанова - штраф 30 базавых велічынь.

**Дзмітрыя Дашкевіча** (14-30, суддзя А. Якунчыхін), пастанова - штраф 20 базавых велічынь.

**Аляксея Янукевіча** (10-00, суддзя Л. Гарчыліна), пастанова - штраф 35 базавых велічынь.

**Мікалая Казлова** (10-00, суддзя Дубаневіч), пастанова - штраф 40 базавых велічынь.

**Віталя Рымашэўскага** (суддзя Фёдарава), пастанова - штраф 10 базавых велічынь. Суд над Віталём Рымашэўскім прайшоў за 7 хвілін. За гэты час былі апытаныя ўсе сведкі і вывучаныя ўсе матэрыялы справы.

і намесніка старшыні Руху "За Свабоду" **Алеся Лагвінца**. Яго пакаралі у судзе Цэнтральнага раёна за акцыю на Кастрычніцкай плошчы 19 сакавіка штрафам у памеры 15 базавых велічынь.

Раней за ўдзел у Дні волі былі аштрафаваныя палітыкі Уладзімір Някляеў і Анатоль Лябедзька - па 50 базавых велічыняў кожны.

Твитнуть








Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных

Бабруйчаніна будуць судзіць за "публічныя заклікі да арганізацыі мітынгу". Распавядаем, што гэта за артыкул

"Не менш за 100 000 чалавек укрыліся за мяжой". Выйшаў даклад УВКПЧ ААН пра сітуацыю ў Беларусі (дакумент)

WWW.GAZETABY.CO

## ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"

У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў



ГАЛОЎНАЕ










## АПОШНІЯ НАВІНЫ

Заява праваабаронцаў аб прызнанні 11 палітычных зняволеных

Старэйшыну баптысцкай царквы “Новая Зямля” Андрэя Мамойку і яго жонку Веру асудзілі да “хатняй хіміі”

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Шэсць еўрапейскіх парламентарыяў сталі "хроснымі" для беларускіх палітвязняў

Да 20 гадоў калоніі: фігурантам "справы Nexta" запрасілі тэрміны

Затрыманне футбольнага фаната, новы "тэрарыст": хроніка пераследу 21 красавіка (дапоўнена)

Былога ўчастковага асудзілі да 6 гадоў калоніі па справе "Чорнай кнігі Беларусі"

"Не хацелася, каб хтосьці трапляў туды". Экс-палітзняволены Аляксандр Бабко распавёў пра пераслед па "справе цюкоў"

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

# Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

## Рэферэндум 2022

ВЫДАННІ






## Напрамкі дзейнасці

## ПАРТНЁРСТВА

## СЯБРОЎСТВА

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY